

Каля 6 мільёнаў тамоў захоўваецца ў фондах Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна. Сёння яна з'яўляецца буйнейшай навуковай бібліятэкай рэспублікі, дзяржаўным кнігасховішчам, рэспубліканскім цэнтрам метадычнай, бібліяграфічнай і навуковай работы. Яе кніжныя багацці задавальняюць самыя глыбокія і разнастайныя запатрабаванні чытачоў па пытаннях навукі, тэхнікі, літаратуры, мастацтва.

**НА ЗДЫМКУ:** у фанатэцы бібліятэкі можна паслухаць запісы класічнай і сучаснай эстраднай музыкі. Галоўны бібліёграф аддзела мастацтва Святлана Мікалаеўна Кавязіна (справа) дапамагае чытачам — народнаму артысту БССР, галоўнаму хармайстру Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР Аляксею Пятровічу КАГАДЗЕЕВУ і старшаму выкладчыку інстытута культуры Марыне Сяргееўне ПАПОВАЙ выбраць неабходную пласцінку.

Фота Д. Лупача.